ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 32 (889) ● Чацвер, 12 лістапада 1970 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIV

**СЁННЯ Ў НУМАРЫ:**

● У ПАРТКОМЕ І МЯСЦКОМЕ ● СПРАВЫ ПРАКТЫКАНТАЎ ● КАНКРЭТНАЯ РАБОТА — ПАКАЗЧЫК СВЯДОМАСЦІ ● СПЕЦЫЯЛІСТ І ЗАМЕЖНАЯ МОВА ● ПА СТАРОНКАХ КАМСАМОЛЬСКАЙ ГІСТОРЫІ ● ВЫСТАЎКА НОВАЙ КНІГІ ● БАЛГАРЫЯ ВА ЎСПАМІНАХ ● ПАПАЎНЕННЕ ЛІТАРАТУРНАЙ ЛЕНІНІЯНЫ.

АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

## У ПАРТКОМЕ

распрацаван план арганізацыйнай і агітацыйна-прапагандысцкай работы ў сувязі з выбарамі ў народныя суды, якія адбудуцца 13 снежня 1970 года. Адпаведна плану ва універсітэце стварaецца выбарчы ўчастак, абсталёўваецца агітпункт, плануецца работа агіткалектыву.

На працягу лістапада пройдуць сходы сакратароў партарганізацый і дэканаў факультэтаў, а таксама партыйныя сходы ва ўсіх партарганізацыях па пытаннях падрыхтоўкі да выбараў.

Агітацыйнай, масавай рабоце ў сувязі з выбарамі ў народныя суды будзе прысвечана нарада загадчыкаў кафедраў грамадскіх і юрыдычных навук, кіраўнікоў таварыства «Веды», мясцкома, камітэта камсамола і прафкома.

## У МЯСЦКОМЕ

створана 10 пастаянных камісій і зацверджаны іх старшыні і загадчыкі сектараў. Абавязкі размеркаваны наступным чынам:

**В. А. Сарока** — сакратар мясцкома, загадчык пратакольнай часткі;

**М. Д. Ціва** — старшыня арганізацыйнай камісіі;

**А. С. Фядзенка** — старшыня вытворчай камісіі;

**Ю. І. Драгун** — старшыня палітыкавыхаваўчай камісіі;

**Л. А. Паўловіч** — старшыня культурна-масавай камісіі;

**М. В. Мяцельскі**—старшыня жыллёва-бытавой камісіі;

**К. В. Сабіла** — старшыня камісіі па ахове працы і тэхніцы бяспекі;

**В. Ф. Чыгір** — старшыня камісіі сацыяльнага страхавання;

**М. Г. Юркевіч** — старшыня камісіі па пенсійных пытаннях;

**Д. М. Саковіч** — старшыня камісіі па грамадскаму харчаванню;

**М. М. Кучынскі** — старшыня спартыўна-масавай камісіі;

**М. Д. Міхей** — загадчык сектара арганізацыі летняга адпачынку дзяцей выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта.

**А. В. Шыбаева** — загадчык сектара падрыхтоўкі матэрыялаў для выдачы матэрыяльнай дапамогі членам прафсаюза.



*НА ЗДЫМКУ: ва універсітэцкай калоне дэманстрантаў.*

Фота М. Нечыпарэнкі.

## АДЗІНАЙ СЯМ'ЁЙ

**Святочныя дні 53-й гадавіны Вялікага Кастрычніка радасна адзначыў адзінай сям'ёй універсітэцкі калектыў. У час урачыстага пасяджэння перапоўненай была актавая зала галоўнага корпуса. У госці да студэнтаў, выкладчыкаў, супрацоўнікаў прыйшлі ветэраны нашай партыі: дэлегат першага з'езда жанчын-работніц, член партыі з 1917 года Аляксандра Іванаўна Морава і Герой Савецкага Саюза, сакратар Мінскага падпольнага абкома партыі у гады Вялікай Айчыннай вайны Раман Навумавіч Мачульскі.**

**А. І. Морава расказала студэнцкай моладзі аб першых гадах Савецкай улады, аб тых цяжкасцях, якія давялося пераадолець, аб ролі жанчын у будаўніцтве новага, сацыялістычнага ладу.**

**Гераічнай старонцы гісторыі нашага народа прысвяціў сваё выступленне Р. Н. Мачульскі. Ён успомніў баявыя эпізоды партызанскай дзейнасці, свята Кастрычніка у суровыя гады вайны, калі лепшым падарункам Радзіме былі знішчаныя фашысцкія гарнізоны, падарваныя эшалоны з жывой сілай і тэхнікай ворага.**

**Удзячныя гаспадары паднеслі дарагім гасцям букеты кветак. А потым універсітэцкія артысты далі вялікі канцэрт мастацкай самадзейнасці.**

**А. АЛЕНІЧ.**

## У ГОНАР З'ЕЗДА

**На адкрытым партыйным сходзе камуністы факультэта журналістыкі абмеркавалі свае абавязацельствы ў гонар XXIV з'езда КПСС. Сакратар партбюро М. Е. Дастанка прапанаваў увазе прысутных шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных будучай знамянальнай падзеі ў жыцці народа. Камуністы унеслі свае дапаўненні і абавязаліся шырока асвятляць ход падрыхтоўкі да з'езда у агульнафакультэцкай і насценных газетах кур сау. Да адкрыцця з'езда вырашана выпусціць спецыяльны нумар вучэбнай газеты «Журналіст».**

**Трэба адзначыць, што работа па выкананню абавязацельстваў ужо вядзецца.**

**А. МІХАЛЬЧАНКА.**

## ПРЫСВЕЧАНАЯ ІЛЬІЧУ

У дні святкавання Вялікага Кастрычніка ва універсітэце прайшла літаратурная канферэнцыя пад дэвізам «Ленін заўсёды з табой».

— Бессмяротны вобраз Ільіча блізкі і дарагі ўсяму чалавецтву, — сказаў ва ўступным слове дацэнт кафедры рускай савецкай літаратуры У. С. Карабан,— таму зразумела жаданне мільёнаў людзей бачыць адлюстраваны ў літаратуры воблік таго, хто поўнасцю прысвяціў сваё жыццё барацьбе за лепшую будучыню.

На канферэнцыі выступілі студэнты філалагічнага факультэта Е. Курносенка, С. Грукала, А. Тарасюк, М. Чарнушына, Г. Горбач і іншыя.

**М. КАРПОВІЧ.**

## ПРЫСТУПІЛІ ДА РАБОТЫ

*Газета матэматычнага факультэта «Рошым любую задачу» паведамляе аб першых кроках новага састава прафбюро. Ужо адбылося некалькі пасяджэнняў, на якіх абмяркоўваўся састаў камісій, складаліся планы работы. У інтэрв'ю, якое правяла газета, старшыня прафбюро І. Пыско расказвае аб цікавых справах, якія наважваецца зрабіць прафбюро у сёлетнім годзе. Так, акадэмічны сектар, акрамя работы з адстаючымі, будзе наладжваць чытанне лекцый аб факультэце у час канікул у школах Мінска. Культмасавы сектар возьмецца за арганізацыю эстраднага аркестра.*

*Л. ПЕРАСЫПКІНА.*



## ПАСВЯЧЭННЕ Ў СТУДЭНТЫ

Першакурснік! Усяго некалькі месяцаў назад ён нясмела уваходзіў у студэнцкія аўдыторыі, а сёння стаў паўнапраўным членам універсітэцкай сям'і.

У першакурснікаў філалагічнага факультэта, напэўна, самы хвалюючы дзень у жыцці быў 2 лістапада. У гэты дзень учарашнім школьнікам, рабочым заводаў, воінам Савецкай Арміі былі ўручаны студэнцкія білеты і заліковыя кніжкі.

З прывітальным словам да першакурснікаў звярнуўся дэкан філалагічнага факультэта А. А. Волк. Ён ад імя выкладчыкаў пажадаў першакурснікам пажадаў ім поспехаў у студэнцкім жыцці. Шмат добрых нажаданняў пачулі першакурснікі і ад старэйшых сяброў. А потым прагучалі урачыстыя словы клятвы, у якой студэнты абяцалі з усёй сур'ёзнасцю адносіцца да вучобы, да грамадскіх даручэнняў, ніколі не падводзіць сваіх сяброў. Кожны з іх ступіў на нялёгкую студэнцкую дарогу адлегласцю ў пяць год.

**А. ВАЛОДЗІН.**

Палітінфармацыя на другім курсе біяфака. Аб маладзёжных арганізацыях за рубяжом расказваюць Таня Злотнік і Валя Дземчанка.

Фота **Д. Чаховіча.**

# НЕ ЗАБЫВАЦЬ, А ЎДАСКАНАЛЬВАЦЬ

На сучасным этапе развіцця навукі і тэхнікі, калі кожнаму спецыялісту неабходна атрымаць навукова-тэхнічную інфармацыю з першакрыніцы, важнае значэнне набывае веданне замежных моу. Таму выкладчыкі імкнуцца даць студэнтам не толькі патрэбныя веды, але і выпрацаваць навыкі чытання і разумення літаратуры па спецыяльнасці на замежнай мове з мінімальным выкарыстаннем слоуніка, а таксама навучыць будучага спецыяліста рабіць кароткія паведамленні па тых ці іншых пытаннях сваей галіны навукі. Як вядома, чытанне літаратуры па спецыяльнасці прынясе тым больш карысці і задавальнення, чым больш яно будзе накіравана на разуменне і здабыванне з чытаемага тэкста інфармацыі, карыснай для студэнта.

Аднак для таго, каб максімальна наблізіцца да такога узроуню, трэба мець значны слоунікавы запас па данай спецыяльнасці, а таксама неабходныя веды у галіне граматыкі і сінтаксіса. Такую падрыхтоуку дае работа над агульнымі тэкстамі. Набываючы такім чынам на агульных занятках уменні і навыкі вуснай мовы і чытання, студэнты рыхтуюцца да самастойнай работы над тэкстам, г. зн. да чытання неадаптаванай літаратуры па спецыяльнасці.

Так, напрыклад, многія студэнты III курса хімічнага факультэта выпісваюць спецыяльны часопіс на нямецкай мове, які выдаецца ў ГДР, а таксама чытаюць іншую арыгінальную літаратуру па спецыяльнасці, узбагачаючы такім чынам веды па сваей будучай прафесіі. І нягледзячы на малую колькасць гадзін, якія адводзяцца вучэбным планам, а таксама часам на слабую школьную падрыхтоуку, студэнты к канцу навучання авалодваюць у пэуным аб'ёме навыкамі гутарковай мовы, накопліваюць значны запас слоу і чытаюць даволі складаныя артыкулы па спецыяльнасці, рэферыруюць іх, а таксама паспяхова спрауляюцца з грамадска-палітычнымі тэкстамі.

Добрасумленна працавалі над мовай і выдатна вытрымалі экзамен студэнты цяперашняга IV курса хімічнага факультэта Гаген, Поздзеу, Сямешка, Чарнавіна, Дземідовіч, Кушнер, Казакова і іншыя. Многія з іх працягваюць работу над мовай і цяпер (факультатыуна).

Добра спрауляюцца са складанымі тэкстамі па спецыяльнасці і студэнты III курса Веліканау, Баудзей, Літвіненка, Ігнаценка, Арсеньеу, Голубева, Грэбнёва, Дронец, Острыкава, Марозава, Катуніна, Бадзеева, Ярмолава, Жаверка.

Вялікую дапамогу аказваюць нам у рабоце тыя кафедры, якія рэкамендуюць студэнтам літаратуру на замежных мовах. Так, у мінулым годзе па рэкамендацыі дацэнта В. В. Свірыдава чыталі літаратуру на замежнай мове студэнты Сямешка, Сакалоу і іншыя.

Сістэматычная рэкамендацыя літаратуры на замежнай мове спецыяльнымі кафедрамі для курсавых і дыпломных работ значна павысіла б інтарэс студэнтау да вывучэння замежных моу і дала б ім магчымасць у далейшым не забываць, а удасканальваць свае веды.

**Р. ВАРАТНІЦКАЯ,**
**ст. выкладчык кафедры нямецкай мовы.**

*СПРАВЫ ПРАКТЫКАНТАЎ*

# У РОАІ НАСТАЎНІКАЎ

З 1 кастрычніка пачалася педагагічная практыка ў студэнтаў пятага курса біялагічнага факультэта.

Я курырую невялікай групай студэнтаў - біяхімікаў (К. Буланава, С. Мартыноўская і І. Мароз), якія практыкуюцца у 41-й школе. У азнаямленчы перыяд, прыкладна каля тыдня, студэнты наведвалі урокі многіх настаўнікаў, знаёміліся з рознымі метадамі вядзення заняткаў і метадычнымі прыёмамі, якія актывізуюць пазнаваўчую дзейнасць вучняў. Асабліва нам спадабаліся урокі настаўніцы рускай мовы Ю. І. Граковіч: дакладныя, прадуманыя, натхнёныя, у час якіх увесь клас актыўна працаваў. Яны былі ўзорам сапраўднай настаўніцкай творчасці.

У гэты ж перыяд студэнты пазнаёміліся з планам выхаваўчай работы школы. Падрабязна аб ім расказала завуч па выхаваўчай рабоце Таісія Рыгораўна Каленікава. Тады ж студэнты былі размеркаваны па класах для правядзення выхаваўчай работы.

У перыяд актыўнай практыкі студэнты далі па 2—3 пробныя урокі і павінны былі правесці па 10—12 заліковых, у тым ліку 2—3 урокі па хіміі.

Першай выступіла ў ролі настаўніка ў дзесятым класе К. Буланава. Тэма яе урока—«Значэнне эвалюцыйнай тэорыі Дарвіна»—была адказнай і нялёгкай. Практыкантка загадзя пастаралася вывучыць клас, неаднаразова была на ўроках біялогіі, улічыла аб'ём матэрыялу, які звычайна паспявае растлумачыць настаўніца біялогіі. І першы ўрок прайшоў нядрэнна. Арганізавана пачалося франтальнае апытванне вучняў, новы матэрыял быў растлумачан поўна і даступна. Праўда, не было дакладнага рытму ў правядзенні урока, часам дэбютантка сама адказвала за вучняў. Гэтыя недахопы студэнтка лёгка выправіла пры правядзенні наступных урокаў.

Паспяхова пачаў практыку І. Мароз. Яго ўрокі добра арганізаваны. Ён насычае тлумачэнне новага матэрыялу удалымі прыкладамі, якія дапамагаюць школьнікам лепш зразумець матэрыял. У 8-х класах, дзе Іосіф Мароз дае ўрокі анатоміі, рабяты яго добра ведаюць і ўспрымаюць як свайго настаўніка. Дарэчы, у І. Мароза паспяхова праходзіць і выхаваўчая работа ў 9 «А» класе. Добра адклікаецца аб практыканце класны кіраўнік Ю. І. Граковіч.

Уключыліся практыканты і ў пазакласную работу па біялогіі. Яны прымаюць удзел у правядзенні факультатыўных заняткаў па біялогіі для вучняў 9-х класаў. У факультатыве займаюцца 15 школьнікаў, зацікаўленых біялогіяй. У снежні студэнты сумесна з настаўнікам плануюць правесці школьную канферэнцыю па оіялогіі.

Практыка ў школе працягваецца. Яна дапаможа студэнтам набыць неабходны вопыт у методыцы вядзення ўрока, у выхаваўчай рабоце. Пажадаем ім поспеху!

**Л. КАМЛЮК,**
**метадыст, кандыдат біялагічных навук.**





*НА ЗДЫМКУ: урок біялогіі у 8-м класе. Вядзе яго студэнт V курса І. Мароз.*

*Фота Д. Чаховіча.*

*ДАВАЙЦЕ АБМЯРКУЕМ*

# ДАВЕР'Е І САМАСТОЙНАСЦЬ

Пытанні вучобы часта абмяркоуваюцца на камсамольскіх сходах. Але як? Далей канстатацыі лічбау тут размова не ідзе: столькі выдатнікау, столькі «хвасцістау». Прауда, бываюць «лірычныя» адступленні у адрас тых ці іншых. І кропка. Разабрацца, чаму усё ж «хвасты» бываюць з году у год, напрыклад, па адных і тых жа прадметах, нашы камсамольцы не бяруцца. А каму, як не нам (акрамя арганізатарскай работы, канцэртау, дыспутау), заняцца сур'ёзнай справай? Прычым не чакаючы распараджэння зверху.

Чаму б камсамольскім арганізацыям не выступіць ініцыятарамі такіх камсамольскіх сходау, дзе б абмяркоувалася вучэбная праграма. Можна было б рабіць гэта раз у паугода, пасля здачы сесіі, пры падвядзенні вынікау семестра.

Безумоуна, студэнты не могуць самастойна выпрацаваць гэтую праграму. Але сумесна з выкладчыкамі зрабіць нейкія пэуныя вывады, безумоуна, можна. І хто ведае, можа якраз за гэта Міністэрства вышэйшай адукацыі сказала б нам дзякуй.

Я не хачу ідэалізаваць студэнтау. Трапляюцца сярод нас і такія, хто прыйшоу у вну проста таму, што трэба было некуды ісці і удалося прайсці. Таму і на лекцыі ходзяць па-рознаму. Адны—за ведамі, другія — таму, што можа быць праверка, а трэція—таму, што нельга ж не хадзіць, як-ніяк вучыцца ж трэба. (Хачу адразу сказаць, што апошніх—адзінкі). Вынік жа такога наведвання і адносін да вучобы сумны. Выкладчыкі скардзяцца на недысцыплінаванасць аудыторыі.

Чаму б на камсамольскім сходзе не паспрабаваць вырашыць і гэтую праблему, Прауда, тут існуе і другі бок. Студэнты па свайму развіццю і ведах не аднолькавыя. Часта здараецца, асобным з іх не цікава слухаць тое, што яны ужо ведаюць. І многія з выкладчыкау цвяроза прапаноуваюць тым, хто знаём з пэунымі пытаннямі курса, не траціць марна часу, не таптацца на месцы, а дазваляюць пайсці у чытальную залу і больш глыбока заняцца вывучэннем курса, рэкамендуюць літаратуру.

Ёсць правілы, па якіх асобным студэнтам дазваляецца свабоднае наведванне лекцый. Але гэта права прадастауляецца вельмі рэдка. Вядома, можна зразумець і дэканат, яго страх перад тым, што асобныя студэнты могуць злоужываць гэтым правам.

А чаму б не даверыць камсамольскаму сходу хоць бы прадстауляць у дэканат кандыдатуры на права свабоднага наведвання. Людзям, якія з году у год вучацца разам, лепш відаць, каму можна прадаставіць такое права.

Час сур'ёзна падумаць, чаго мы варты як камсамольцы кожны паасобку, як мы—камсамольцы—ставімся да кожнай сучаснай праблемы і перш за усё да сваёй асабістай вучобы як будучыя спецыялісты, бо іменна ад яе у будучым і будзе залежаць патрэбнасць грамадства у кожным з нас паасобку.

**Л. ВАНЧУКЕВІЧ,**
**студэнтка IV курса журфака.**

# ХТО БУДЗЕ ЛЕПШЫМ?

З 1 кастрычніка студэнцкі буфет, што знаходзіцца ў галоуным корпусе, уключыуся у рэспубліканскі агляд-конкурс. Аб гэтым паведамляе і плакат, вывешаны на адной са сцен залы. Пры падвядзенні вынікау будзе улічвацца знешні выгляд абедзеннай залы, асартымент і каларыйнасць страу. Таму, каб дабіцца поспеху, калектыву буфета трэба многа працаваць, пераадолець шмат цяжкасцей. І адна з іх заключаецца ў тым, што гарніры і першыя стравы даводзіцца рыхтаваць на месцы: са студэнцкай сталовай, якой належыць буфет, прывозяць толькі пауфабрыкаты.

— Вельмі важна не толькі смачна, але і своечасова прыгатаваць страву, —расказвае адміністратар Ганна Сяргееуна Яцук,—і калектыу стараецца своечасова прыгатаваць для наведвальнікау больш недарагіх і смачных страу.

На раздачы вы бачыце маладых, спрытных і любячых сваю справу паварoу Галю Грыбкоускую, Ліду Цэніч, Алу Хоміч і Алу Прохарчык.

Выдатным майстрам лічаць у калектыве повара Ганну Якаулеуну Несцяровіч, якая больш 20 год аддала кулінарнай справе. З павагай адклікаюцца і аб старэйшай работніцы Ганне Фёдараўне Казачонак.

У калектыве не шкадуюць асабістага часу, калі ёсць неадкладная работа. Так было і у перадсвяточны дзень, калі усе повары адпрацавалі амаль цэлыя суткі, рыхтуючы для удзельнікау дэманстрацыі халодныя закускі, бутэрброды, святочныя падарункі.

Хочацца верыць, што такі калектыу будзе ў ліку першых сярод удзельнікау рэспубліканскага конкурсу.

**І. КАШАРОЎСКІ.**

# КАБ ПАЗНАЁМІЦЦА З КНІГАЙ

Раз у тыдзень ва універсітэцкую бібліятэку пасгупае літаратура з Цэнтральнага калектара навуковых бібліятэк г. Масквы. Гэта абавязковы экземпляр кніг, выдадзеных у Савецкім Саюзе на рускай мове па профілю універсітэта.

Для таго, каб чытач хутчэй пазнаёміуся з новай літаратурай, даведауся, якія кнігі па цікавячай яго галіне ведау паступілі у бібліятэку, аддзел апрацоукі літаратуры арганізуе выстауку абавязковага экземпляра.

Пачалі мы гэтую работу больш чатырох год назад. Мы стараліся наблізіць кнігу да чытача, рэгулярна інфармаваць яго аб новай літаратуры. Выстаука размяшчалася у маленькім пакоі пры навуковай чытальнай зале. Але ад гэтага прыйшлося адмовіцца, таму што наведвалі яе толькі навуковыя супрацоунікі, якія займаюцца у чытальнай зале. Нам жа хацелася, каб з навінкамі пазнаемілася як мага больш людзей. Выйсце было знойдзена. Аблюбавалі бойкае месца. І цяпер усе, хто прыходзіць у аўторак у аддзел дамашняга абанемента на другім паверсе галоунага корпуса або у навуковую чытальную залу, можа правесці некалькі прыемных хвілін адзін на адзін з новай кнігай. Пазнаёміцца з толькі што паступіушай літаратурай могуць і выкладчыкі, і студэнты, і супрацоунікі універсітэта.

Як жа арганізуецца выстаука! Партыя кніг, якая прызначана для чаргової пакаразу, загадзя апрацоуваецца. На кнігу наносіцца інвентарны нумар, шыфр, гэта значыць яна атрымлівае месца на паліцы і у каталогу, афармляецца каталожная картка і г. д. Усе кнігі на выстауцы раскладваюцца па прыналежнасці да пэунай галіны навук: грамадска-палітычная літаратура, прыродазнаучая і тэхнічная, мастацкая, літаратуразнаучая і інш. Бібліятэка выстауляе абсалютна усе атрыманыя абавязковыя экземпляры: ад манументальных прац да брашур.

Знайшоушы патрэбную для сябе кнігу, чытач можа аформіць заяуку і на наступны дзень атрымаць кнігу для карыстання.

У дзень выстаукі кнігі не выдаюцца, таму што іх павінны прагледзець многія чытачы. За дзень іх бывае больш 200.

Акрамя абавязковага экземпляра, на выстауцы экспануецца літаратура, атрыманая з іншых вну краіны. Гэта у асноуным малатыражная літаратура, але маючая навуковую каштоунасць. Па абмену разам з кнігамі, якія выдаюцца на рускай мове, бібліятэка атрымлівае літаратуру на мовах народау СССР. У большасці выпадкау гэта літаратура мае рэзюме [кароткі змест на рускай мове], што дазваляе нашым чытачам быць у курсе развіцця навукі у братніх рэспубліках. Так, дзве з апошніх выставак экспанавалі якраз літаратуру абменнага фонду. Раз у тыдзень, па панядзелках, у навуковай чытальнай зале выстауляюцца аутарэфераты.

Выстаука літаратурных навінак выклінае вялікую зацікауленасць у чытачоу. Нам прыемна, што у яе ёсць пастаянныя прыхільнікі: выкладчыкі Л. Г. Міронычкау, М. В. Рожын, І. І. Камяк, Д. Б. Мельцар, І. І. Шаціла, А. С. Акінчыц, А. А. Вечар, Я. Б. Асіпкоу і многія іншыя. Частыя госці тут і аспіранты, студэнты. Аб папулярнасці гавораць водгукі чытачоу у кнізе прапаноу: «Шчырае дзякуй за выстауку», «Бібліятэка робіць вялікую, вельмі патрэбную справу, арганізуючы выстауку паступаючай літаратуры. Наведанне яе дае магчымасць азнаёміцца са зместам многіх работ. Выстаука эканоміць час»...

Аператыуны паказ навінак з'яуляецца адной з дзейсных форм інфармацыі, і пажадана, каб ёю карысталася як мага больш прадстаунікоу універсітэцкага калектыву.

На жаль, кнігі, прызначаныя для выстаукі, даводзіцца раскладаць на сталах. Гэта часам робіць нязручным доступ да іх, пра што гавораць і наведвальнікі. Вось што піша у сваім водгуку в. а. дацэнта кафедры гісторыі філасофіі і логікі М. В. Рожын: «Сама ідэя арганізацыі выставак новых паступленняу вельмі добрая. Яна дае магчымасць сачыць за навінкамі сістэматычна. За гэта арганізатарам вялікае дзякуй. Пры гэтым пажадана адшукаць для выстаукі больш падыходзячае месца, не настолькі цеснае, такое, дзе б можна было дэталёва агледзець і азнаёміцца з кнігай».

Канешне, было б лепш, калі б кнігі стаялі на паліцах, але іх няма дзе размясціць: мы абмежаваны у плошчы. Пытанне гэтае для бібліятэкі — балючае пытанне. Хацелася б мець спецыяльны пакой для выставак, тады б чытачы, праглядаючы кнігу, мелі магчымасць рабіць патрэбныя выпіскі, ды і выстаука магла б дзейнічаць некалькі дзён, а то і тыдзень, як гэта практыкуецца у бібліятэках некаторых вну. Акрамя таго, асобны пакой садзейнічау бы захаванню фонду. Мы ж выстауляем абавязковы экземпляр, адзіны, і, калі здарыцца прапажа, яго цяжка замяніць. На жаль, даводзіцца адзначыць, што выстауленыя кнігі часам «пакідаюць» бібліятэку разам з чытачамі.

І усё ж кожны аўторак у 12.00 на дамашнім абанеменце адкрываецца агляд бібліятэчнага папаунення. Прыходзьце, дарагія сябры, знаёмцеся! Вашы пажаданні і водгукі аб рабоце выстаукі просім накіроуваць у газету «Голас чытача» або запісваць у кнізе водгукау і прапаноу.

**А. ПЕРАПЛЁТЧЫК,**
супрацоунік бібліятэкі.

# У ГАРНІЛЕ ЖЫЦЦЯ

Апошняе дзесяцігоддзе у гісторыі грамадскіх арганізацыи універсітэта характарызуецца новым напрамкам у рабоце — рухам за камуністычную працу. Мэта руху—дабіцца ад кожнага члена калектыву максімальнай аддачы сіл у барацьбе за набліжэнне камунізма. Сэнс руху расцэньвауся ва універсітэце як увасабленне асноунага прынцыпу камуністычнага грамадства: праца ад кожнага па здольнасцях. Камсамольская арганізацыя БДУ усямерна садзейнічала развіццю гэтага руху, імкнулася накіраваць энтузіязм і творчую энергію студэнцтва на выкананне рэальных сацыялістычных абавязацельстваў. Добрасумленныя адносіны да вучобы, заняткі навукова-даследчай работай, паусядзённы удзел у грамадскім жыцці, спалучэнне сваёй вучобы і выхавання з працай рабочых і калгаснікау—так былі вызначаны вядучыя формы удзелу студэнтаў у камуністычнай працы, якая у 60-х гадах стала асноуным зместам грамадскай дзейнасці універсітэта.

Ва умовах далейшай дэмакратызацыі вышэйшай школы нязмерна узрасла роля студэнцкага актыву у пытаннях арганізацыі вучэбна-выхаваўчай работы. Найбольш яркай формай студэнцкага самакіравання сталі універсітэцкія і факультэцкія акадэмічныя саветы і камісіі, у склад якіх увайшлі камсамольскія і прафсаюзныя акадэмсектары, прадстаунікі партыйных арганізацый і адміністрацыі. У сферу іх дзейнасці увайшлі улік і кантроль за паспяховасцю і наведваннем заняткау, падрыхтоука і правядзенне экзаменацыйных сесій, пытанні, звязаныя з прыёмам і арганізацыяй працы новых студэнтау, назначэннем стыпендый, размеркаваннем маладых спецыялістау і г. д.

Пад кірауніцтвам акадэмсаветау і камісій разгарнулася спаборніцтва за камуністычныя адносіны да працы і вучобы, этапамі якіх з'явіліся агляды студэнцкіх акадэмічных груп. У 1968-69 навучальным годзе быў праведзен першы этап конкурсу у гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Пераможцамі аказаліся III курс аддзялення філасофіі гістарычнага факультэта і 13-я група IV курса фізічнага факультэта.

Акадэмсаветы заняліся пытаннямі навуковай арганізацыі працы. Створаная імі студэнцкая сацыялагічная група правяла хранаграфію рабочага дня студэнтау I, III і V курсаў. Гэта дазволіла акадэмкамісіям даць карысныя парады па арганізацыі самастойнэй працы студэнтау. Камсамольскія арганізацыі гістарычнага, філалагічнага, фізічнага і хімічнага факультэтау накапілі вопыт курыравання старэйшых груп над малодшымі.

Сацыялагічная група даследавала праблему перадолення псіхалагічнага бар'еру у працэсе адаптацыі школьніка да студэнцкага асяроддзя. Яна распрацавала практычныя рэкамендацыі, як арыентавацца у патоку інфармацыі, як лепш канспектаваць лекцыі і правільна размяркоуваць час і г. д. Групай былі унесены прапановы аб змяненні методыкі выкладання некаторых лекцыйных курсау і правядзення практычных заняткау.

У апошні час у дзейнасці акадэмсаветау выключнае значэнне набыла праблема прафесіянальнай арыентацыі будучых студэнтаў. Адзін са шляхоу яе вырашэння камітэт камсамола знаходзіць у арганізацыі грамадскіх прыёмных камісій. У 1969 годзе у рабоце такой камісіі удзельнічала больш 40 студэнтау старэйшых курсаў. Выступленні у школах, сустрэчы з выпускнікамі сельскіх і гарадскіх сярэдніх школ, заняткі на падрыхтоучых курсах, субяседаванні і кансультацыі—такія формы работы камісій, пачынаючы з другога паугоддзя кожнага навучальнага года.

У цэнтры увагі грамадскасці універсітэта знаходзіцца работа студэнцкага навуковага таварыства. Прывіццё даследчых навыкау — не добрае пажаданне, а сур'ёзнае патрабаванне часу. Без глыбокіх ведау не можа быць навуковай творчасці. Даследчая дзейнасць павышае зацікауленасць да вучобы, прывучае да сістэматычнай апрацоукі ведау, беражлівага размеркавання часу і забяспечвае больш глыбокае засваенне вучэбнага матэрыялу. Вось чаму камсамольская арганізацыя універсітэта актыуна падтрымлівае і усямерна распаусюджвае такія формы студэнцкага навуковага даследавання, як навуковыя гурткі, семінары, канферэнцыі, літаратурныя аб'яднанні, студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі, ваенна-навуковае таварыства, індывідуальныя пошукі.

Старанны адбор абітурыентау, дапамога першакурснікам і адстаючым, удзеянне на нядбайных, меры па паляпшэнню арганізацыі навучальнага працэсу і навукова-даследчай дзейнасці не маглі не сказацца на выніках экзаменацыйных сесіи і навуковых канферэнцый. У 1968-69 навучальным годзе агульная паспяховасць дасягнула 86 працэнтау, а у работу СНТ уключыуся кожны трэцічацвёрты студэнт універсітэта. На рэспубліканскі агляд-конкурс 1968-69 навучальнага года універсітэт прадставіу 320 навуковых студэнцкіх работ; з іх 107 былі аднесены да першай катэгорыі. На Усесаюзным конкурсе гэтага года аутары трох работ з БДУ атрымалі званні лаурэатау і медалі конкурсу, а аутары 20 работ былі адзначаны граматамі і падзякамі МВ і ССА СССР.

Рэалізуючы рашэнні XXIII з'езда КПСС і прынятыя на іх аснове пастанауленні ЦК КПСС і Савета Міністрау СССР, шматлікі атрад работнікау універсітэта узяу цвёрды курс на усебаковае паляпшэнне работы па ідэалагічнаму выхаванню маладога пакалення. Прынцыпова новым крокам у гэтым напрамку стала практыка перспектыунага планавання такой работы. У 1967 г. быу прынят пяцігадовы план выхавaучай дзейнасці сярод студэнтау універсітэта і на яго аснове распрацаваны факультэцкія планы, у якіх прадугледжана цэлая сістэма розных форм выхавання студэнтау з улікам спецыфікі факультэтау і курсау. Адпаведна яму наладжвае сваю работу і камсамольская арганізацыя.

Важнейшай формай палітычнай загартоукі моладзі і выхавання ідэйнай пераканнасці з'яуляецца арганізацыя шырокіх дыскусій па праблемах філасофіі, сацыялогіі, эканомікі, культуры, міжнародных адносін, прыродазнаучых і гуманітарных навук. У сувязі з гэтым камсамольскі актыу аднавіу работу дыскусійных клубау.

У сістэме камсамольскай палітасветы шырокае распаусюджанне атрымалі семінары па бягучых палітычных падзеях, тэарэтычныя канферэнцыі, тэматычныя вечары, вечары пытанняу і адказау, пастаянна працуючыя лекторыі «Дыпламатыя у сучасным свеце», «Савецкае кінамастацтва за 50 гадоу» і інш.

Партыйная і камсамольская арганізацыі з'явіліся ініцыятарамі і арганізатарамі многіх спрау, якія садзейнічаюць актывізацыі выхаваучага працэсу і далучэнню да грамадскай работы больш шырокага кола студэнтау. Імі створаны штабы (камсамольскага пражэктара, працоуных спрау, будаунічых атрадау) і новыя клубы (інтэрнацыянальны, рэвалюцыйнай, баявой і працоунай славы), арганізуюцца вусныя часопісы («Палітычны кругагляд», Праметэй», «Глобус» і іншыя).

**В. СІДАРЦОЎ,**
**кандыдат гістарычных навук.**

[Працяг. Пачатак у №№ 12, 18, 26, 27, 28].





Заняткі з першакурснікамі вядзе асістэнт кафедры вышэйшай матэматыкі Л. І. Вядзернікава.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.

